Гомельская Вясна
праваабарончы сайт

У Светлагорскім раёне звальняюць «няўгодных» настаўнікаў

10.01.2022



СШ-4 г. Светлагорска.

У Светлагорскім раёне звольнілі яшчэ трох настаўніц, чыі погляды не супадаюць з поглядамі ўладаў. Дырэктаркі школ запатрабавалі ад іх напісаць заявы аб звальненні «па ўласным жаданні».

Як паведамілі калегі настаўніц, здарылася гэта ў пачатку студзеня. Гаворка ідзе пра сярэднюю школу № 4 г. Светлагорска (дырэктар – **Букіна Лідзія Васільеўна**) і сярэднюю школу імя П. Ф. Стэфаноўскага аграгарадка Чыркавічы Чыркавіцкага сельскага савета Светлагорскага раёна (дырэктар – **Майсеева Людміла Анатольеўна**).

Вядома, што звольненыя настаўніцы раней актыўна выказвалі сваю грамадзянскую пазіцыю адносна забруджвання паветра шкоднымі газамі, што адбывалася ў 2019 – 2020 гадах пры запусках Светлагорскага завода белёнай цэлюлозы, а таксама адносна прэзідэнцкіх выбараў у 2020 годзе. Дырэктаркі школ запатрабавалі ад усіх трох настаўніц напісаць заявы аб звальненні «па ўласным жаданні».

Настаўніцам далі зразумець, што ў выпадку адмовы напісаць такія заявы розныя непрыемнасці чакалі як саміх настаўніц, так і дырэктарак. З гэтага вынікае, што негласнае патрабаванне аб звальненні паступіла, прынамсі, ад кіраўніцтва аддзела адукацыі Светлагорскага райвыканкама.

Ва ўсіх трох выпадках ніякіх працоўных парушэнняў з боку настаўніц не было.

У снежні мінулага года паведамлялася, што па аналагічных прычынах звольнены **Яўгеній Мікалаевіч Таўсцякоў**, настаўнік матэматыкі і інфарматыкі сярэдняй школы № 12 Светлагорска (дырэктар – **Тушынская Марына Пятроўна**).

У артыкуле 33 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь запісана, што «Кожнаму гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне», гэта значыць, што не можа быць законным пакаранне грамадзяніна за палітычныя ці іншыя погляды альбо выказванні праз звальненне з працы.

Аўтар: **В. Аляксейчанка**

Гомельская вясна

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

Вынікі судовых разглядаў адміністрацыйных спраў за 4 і 7 чэрвеня


Распавядаем пра травень у «сутках» і штрафах (+інфаграфіка)

Суткі і штрафы - пакаранне для затрыманых у мінскім парку "Цівалі"

Вынікі разглядаў судамі адміністрацыйных спраў за 31 траўня - 2 чэрвеня

У Мінску пачаўся суд над палітвязнем Іванам Багдзевічам

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ



Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

ВІДЭА

БЛОГІ





ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага ператрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

19.01.2024 Чым палохаюць беларусаў перад выбарамі? радыё «Свабода»

16.01.2024 «Будзьце гатовыя да размовы з гэбістам». Што пішуць у чатах пра допыты на мяжы Беларусі «Новы час»

12.01.2024 Украінскіх дзяцей прывезлі ў Гомель паслухаць ідэолага і святара «Белсат»

12.01.2024 Актывіст з Рэчыцы: Давялося ўцякаць з Беларусі праз тры краіны "Гомель штодзень"

10.01.2024 У Гомелі працягваецца судовы працэс над Алегам Кацапавым – гэта чацвёрты зняволены «талаковец» «Флагшток»

09.01.2024 Міністэрства абароны Беларусі будуе новы вайсковы гарадок за 40 км ад мяжы з Украінай. Што пра яго вядома? радыё

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ

22.01.2024 Нікарагуа і Беларусь узначальваюць спіс аўтарытарных рэжымаў, дзе затрымліваюць святароў і вернікаў

15.01.2024 Бранская вобласць – адна з тэрыторый, адкуль наносяцца ўдары па Украіне


11.01.2024 Тайвань пашырыў спіс тавараў, забароненых для экспарту ў Беларусь

05.01.2024 ААН заклікае абмежаваць прымяненне робатаў-забойцаў. Улады Беларусі – супраць

29.12.2023 Паўднёвая Карэя дадае яшчэ амаль 700 тавараў у спіс забароненых на экспарт у Беларусь

28.12.2023 За перыяд расійскай агрэсіі ва Украіне 122 грамадзяніна Беларусі атрымалі украінскае грамадзянства

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ



ПАРТНЁРЫ

Праваабарончыя сайты:

Брэст Віцебск Гародня Магілёў

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com

© 2024 Гомельская вясна